Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
_______________ А. А. Корбут
«____» ____________ 2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД - _____ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# НАРОДНА-АНСАМБЛЕВАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-16 01 06 11 Духавыя інструменты (народныя)*

2018

Вучэбная праграма падрыхтавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-16 01 06-2013 Духавыя інструменты (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя). Рэгістрацыйны № С 16-1-07 /13 вуч.


**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. Л. Карацееў,* прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт


**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В. А. Немцава,* загадчык кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства;

*У. П. Скараходаў,* загадчык кафедры драўляных духавых інструментаў установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», доктар культуралогіі, прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 29.05.2016 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 22.06.2016 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Л. Карацееў

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Народна-ансамблевае выканальніцтва» з’яўляецца адной з састаўных вучэбных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі выканаўцаў на народных духавых інструментах па спецыяльнасці 1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 11 Духавыя інструменты (народныя). Народна-ансамблевае выканальніцтва садзейнічае фарміраванню і развіццю навыкаў сумеснага музіцыравання, выхаванню маладых музыкантаў на лепшых узорах традыцыйнай фальклорнай, народнай, класічнай і сучаснай музыкі. Удзел у ансамблі развівае музыкальныя здольнасці, рытм, слых, уплывае на выпрацоўку больш дасканалага пачуцця ансамблевай ігры, фарміруе калектыўную адказнасць за вынікі сумеснай творчай работы. Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканальніцтва» цесна звязана з такімі творча-выканальніцкімі дысцыплінамі, як «Сольнае і камернае інструментальнае выканальніцтва», «Дадатковы народны духавы інструмент», «Народна-аркестравае выканальніцтва», «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі», «Дырыжыраванне», а таксама з музычна-тэарэтычнымі дысцыплінамі адпаведнай спецыяльнасці: «Методыка работы з фальклорным калектывам», «Чытанне і аналіз аркестравых партытур», «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія», «Нацыянальная і сусветная гісторыя выканальніцтва на народных духавых інструментах» і інш.

Адпаведна распрацаваным адукацыйным стандартам студэнты павінны авалодаць і засвоіць наступныя сацыяльна-асобасныя, акадэмічныя і прафесійныя кампетэнцыі па відах творча-выканальніцкай дзейнасці:

– валодаць навыкамі і здольнасцю да міжасобасных камунікацый;

– умець працаваць у камандзе (мастацкі калектыў; працоўны калектыў установы і г. д.);

– актыўна ўдзельнічаць у творчых мерапрыемствах;

– валодаць базавымі навукова-тэарэтычнымі, музычна-тэарэтычнымі ведамі і выкарыстоўваць іх для рашэння тэарэтычных, практычных і мастацка-творчых задач у галіне выканальніцкай, педагагічнай і навукова-даследчай дзейнасці і сістэма-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тычна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу працоўнай дзейнасці;

– валодаць навыкамі работы з камп'ютарам, вучэбнымі, метадычнымі, інфармацыйна-даведачнымі, навуковымі выданнямі для выканання навукова-даследчай, творча-выканальніцкай і педагагічнай работы;

– пастаянна ўдасканальваць выканальніцкае, педагагічнае майстэрства, умець працаваць самастойна з выкарыстаннем сучасных прагрэсіўных методык, тэхнічных сродкаў навучання, вызначаць аптымальныя мэты і стратэгію навучання. Быць здольным прапанаваць новыя ідэі і валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні арганізацыйна-творчых, вучэбна-метадычных, педагагічных і творча-выканальніцкіх праблем;

– удзельнічаць у якасці артыста ці акампаніятара ў мастацкіх калектывах розных творчых кірункаў (музычных, музычна-харэаграфічных, музычна-харавых);

– актыўна весці музычна-выканальніцкую і музычна-асветніцкую дзейнасць, выконваць праграмы з рознахарактарных твораў у розных формах, жанрах і стылях народнай, акадэмічнай, эстраднай музыкі з улікам пошуку і ўвасаблення мастацкай інтэрпрэтацыі музычных твораў;

– ствараць асабістыя варыянты адаптацыі музычных твораў у выглядзе камп'ютарнай версіі на электронных носьбітах у розных формах, жанрах і стылях народнай, акадэмічнай, эстраднай музыкі для музычных калектываў розных творчых кірункаў (музычных, музычна-харэаграфічных, музычна-харавых).

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – засваенне мастацкіх каштоўнасцей народна-ансамблевага выканальніцтва на лепшых узорах музычнай спадчыны Беларусі, лепшых твораў для ансамбляў розных складаў (аднародныя, роднасныя, змешаныя склады, у тым ліку і з ударнымі інструментамі).

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

1) вывучэнне мастацка-выразных, тэхнічна-выканальніцкіх магчымасцей і асаблівасцей традыцыйнага народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя беларусаў;

2) выкарыстоўванне народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя беларусаў у традыцыйных, тыпавых і нетыпавых складах ансамбляў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3) засваенне жанрава-стылявой спецыфікі ансамблевага выканальніцтва народнай спадчыны і сучасных музычных твораў;

4) развіццё навыкаў афармлення нотнага тэксту ў сольных партыях і партытурах для ансамбляў розных складаў (аднародныя, роднасныя, змешаныя склады, у тым ліку і з ударнымі інструментамі);

5) навучыцца слухаць, аналізаваць інтэрвалы і акорды ў працэсе ігры і пры неабходнасці імгненна выпраўляць інтанацыйны строй.

Падчас заняткаў студэнт набывае практыку калектыўнай ігры. Тут ёсць магчымасць выкарыстоўваць свой вопыт сольнага выканання, імправізацыі і практычна замацоўваць веды па музычна-тэарэтычных дысцыплінах. Ігра ў ансамблі актывізуе гарманічны слых, абвастрае пачуццё музычнага рытму.

Ансамблевае выкананне патрабуе як індывідуальных, так і калектыўных намаганняў для дасягнення агульнага мастацкага выніку і выхоўвае ў студэнтаў пачуццё адказнасці па сумесным выкананні.

У працэсе навучання студэнты павінны *ведаць:*

– класіфікацыю, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыпавых складаў ансамбляў народных духавых (і ўдарных) інструментаў;

– сутнасць ансамблевага выканальніцтва;

– псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя асаблівасці работы з удзельнікамі ансамбля беларускіх народных духавых інструментаў;

– этапы работы над музычнымі творамі, іх змест;

– функцыянальныя мастацка-выразныя магчымасці ансамбляў беларускіх народных духавых (і ўдарных) інструментаў;

– сацыякультурныя аспекты і асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ансамбля беларускіх народных духавых (і ўдарных) інструментаў;

*умець:*

– выкарыстоўваць навыкі настройкі беларускіх народных духавых інструментаў з улікам спецыфікі іх гукаўтварэння;

– ажыццяўляць агічную пабудову фразіроўкі;

– чытаць ноты незнаёмых твораў з ліста;

– выконваць старадаўнюю і сучасную музыку з улікам яе жанрава-стылявых асаблівасцей;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выконваць рознымі штрыхамі традыцыйныя і спецыфічныя прыёмы гукаўтварэння;

– дакладна інтанаваць і іграць на слых;

– расшыфраваць беларускую народную музыку (фальклор і сучасныя творы);

*валодаць:*

– навыкамі выканання варыянтаў музычных твораў і іх трактовак;

– пытаннямі па асаблівасцях выканання метрарытмічных цяжкасцей;

– навыкамі дынаміка-акустычнага балансу ў гучанні ансамбля.

Ансамблі народных духавых інструментаў вельмі разнастайныя як па саставе інструментаў, так і па колькасці выканаўцаў (удзельнікаў). Умоўна ўсе інструментальныя народныя духавыя ансамблі можна падзяліць на некалькі відаў:

– аднайменныя, складзеныя з аднолькавых інструментаў (напрыклад, ансамбль дудак строй «С», ансамбль дуд строй «D» і г. д.);

– роднасныя (напрыклад, ансамбль жалеек, ансамбль акарын);

– змешаныя (спалучэнне розных народных духавых інструментаў і груп).

З мэтай засваення матэрыялаў вучэбнай дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканальніцтва» прадугледжаны прагрэсіўныя метады і тэхналогіі навучання (наглядныя метады, выкарыстанне відэа- і аўдыяматэрыялаў, наглядных дапаможнікаў, партытур і інш.), а таксама ажыццяўленне студэнтамі арганізацыі асабістай самастойнай работы, якая спрыяе пашырэнню іх кругагляду (з гэтай мэтай прапануецца асноўны і дадатковы спіс неабходнай літаратуры па дысцыпліне і спіс твораў з улікам тых абставін, што рэпертуар для ансамбляў беларускіх народных духавых інструментаў вельмі абмежаваны).

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканальніцтва» ўсяго адведзена 776 гадзін, з якіх 312 гадзін складаюць аўдыторныя заняткі. Рэкамендаваныя формы кантролю – залікі, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Сутнасць і мэта вучэбнай дысцыпліны. Структура вучэбнай дысцыпліны: праблемна-тэматычныя раздзелы.

Формы бягучага і выніковага кантролю і віды іспытаў па выяўленні ступені засваення ведаў студэнтамі. Роля набытых ведаў па дысцыпліне ў прафесійным станаўленні будучых спецыялістаў духавога мастацтва Беларусі.

Патрабаванні па вывучэнні матэрыялаў дысцыпліны з улікам розных форм кантролю ведаў і іспытаў.

### *Тэма 1. Змест, асноўныя задачы дысцыпліны*

Асноўны змест праблемна-тэматычных раздзелаў вучэбнай дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканальніцтва». Выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання ў працэсе вывучэння матэрыялаў дысцыпліны. Асноўныя задачы вучэбнай дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканальніцтва».

Месца вучэбнай дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканальніцтва» ў сістэме падрыхтоўкі выканаўцаў на народных духавых інструментах у сферы прафесійнага і аматарскага капэльнага ці аркестравага выканальніцтва.

Сутнасць сувязі вучэбнай дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканальніцтва» з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці.

### *Тэма 2. Арганізацыя заняткаў з ансамблем народных духавых і ўдарных інструментаў : функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыпавых саставаў*

Асаблівасці арганізацыі ансамбляў народных духавых інструментаў у адпаведнасці з існуючай класіфікацыяй тыпавых саставаў (аднайменныя, роднасныя, змешаныя), іх функцыямі, мастацка-выканальніцкімі параметрамі. Тыпавыя выканальніцкія формы ансамбля народных духавых інструментаў (дуэты, трыа, квартэты, квінтэты і інш.) і спецыфіка іх падрыхтоўкі да публічных выступленняў. Асаблівасці аб’яднання народных духавых інструментаў у групы ў складзе ансамбляў народных духавых інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Засваенне сутнасці ансамблевага выканальніцтва і яго роля ў развіцці творчых здольнасцей выканаўцаў на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах*

Асновы сумеснага музіцыравання ў складзе ансамбляў народных духавых інструментаў.

Змест і асноўныя этапы арганізацыі рэпетыцыйнай работы з удзельнікамі розных саставаў ансамбляў народных духавых інструментаў. Шляхі развіцця навыкаў сумеснага музіцыравання ўдзельнікаў ансамбляў народных духавых інструментаў.

Роля ансамблевага выканальніцтва ў працэсе ўдасканалення выканальніцкага майстэрства і фарміравання мастацкага густу ўдзельнікаў ансамбля.

### *Тэма 4. Псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя асаблівасці развіцця асабістых выканальніцкіх здольнасцей удзельнікаў ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Асаблівасці і прынцыпы фарміравання інструментальных саставаў, у склад якіх уваходзяць беларускія народныя духавыя і ўдарныя інструменты. Прынцыпы фарміравання інструктыўнага, мастацкага педагагічнага і канцэртна-выканальніцкага рэпертуару з улікам індывідуальнай падрыхтоўкі выканаўцаў і іх творчых здольнасцей.

Выкарыстанне прынцыпаў дэдукцыі пры рабоце з удзельнікамі ансамбля беларускіх народных духавых інструментаў (прынцып інтарэсу, даступнасць, прафесійная падрыхтоўка і псіхалагічная сумяшчальнасць) з мэтай стварэння творчай атмасферы і аптымальнага маральна-псіхалагічнага клімату.

### *Тэма 5. Штрыхі, традыцыйныя і спецыфічныя прыёмы гукаўтварэння ўдзельнікамі ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Паняцце «штрых» і яго сутнасць. Разнавіднасці штрыхоў. Умоўныя абазначэнні штрыхоў, развіццё навыкаў іх выканання ў кантэксце выканальніцкага параўнальнага аналізу.

Штрыхі як сродак выканальніцкай артыкуляцыі. Асноўныя элементы штрыха: пачатак (атака), гукавядзенне і заканчэнне гучання.

Асаблівасці і прыёмы гукаўтварэння. Узаемасувязь гукаўтварэння і выканання штрыхоў. Асаблівасці выканання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыфічных штрыхоў і выканальніцкія прыёмы гукаўтварэння, якія распаўсюджаны ў традыцыйнай і сучаснай народна-інструментальнай выканальніцкай практыцы.

### *Тэма 6. Сістэмы настройкі беларускіх народных духавых інструментаў*

Спецыфіка асноўных разнастайнасцей настройкі беларускіх народных духавых інструментаў (*меладычная, гарманічная*).

Выкарыстанне розных спосабаў настройкі інструментаў (*камертон; цюнер; пры дапамозе аднаго з беларускіх народных духавых інструментаў*). Асаблівасці карэкціроўкі інтанавання ў працэсе ансамблевага выканальніцтва: прынцып ладатанальнага цягацення; выкарыстанне дадатковай аплікатуры; змяненне параметраў апертуры і амбушура; карэкцыя экспрэсіі выканальніцкага дыхання.

### *Тэма 7. Праблема інтанавання ў практыцы ансамблевага выканальніцтва на беларускіх народных духавых інструментах*

Сутнасць дакладнага інтанавання ў выканальніцкай практыцы. Спецыфічныя асаблівасці інтанавання пры выкананні твораў на беларускіх народных духавых інструментах з улікам этнаарганалагічных і тэхналагічных канструктыўных недахопаў пры вырабе беларускіх народных духавых інструментаў і шляхі іх пераадольвання ў выканальніцкім працэсе.

Узаемаабумоўленасць дакладнага інтанавання і этнаарганалагічнай спецыфікі беларускіх народных духавых інструментаў.

### *Тэма 8. Асаблівасці работы над фразіроўкай пры выкананні твораў для ансамбляў беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Паняцце «фразіроўка» і яе выразная асаблівасць у кантэксце музычнага вакальнага, харавога, інструментальнага выканальніцтва і мастацкай дэкламацыі паэтычных твораў.

Спецыфіка і сутнасць дасягнення аптымальнай фразіроўкі ў рабоце з ансамблямі беларускіх народных духавых інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя элементы фразіроўкі і спецыфіка іх выканальніцкага ўвасаблення ансамблем беларускіх народных духавых (і ўдарных) інструментаў: матыў; перыяд; фраза; кантрапункт.

Сутнасць работы над фразіроўкай у ансамблі беларускіх народных духавых (і ўдарных) інструментаў як сродкам выразнасці ў адпаведнасці са стылістычнымі асаблівасцямі музычных твораў (арыгінальныя творы ці розныя формы іх інтэрпрэтацыі).

### *Тэма 9. Праблемы дынаміка-акустычнага балансу ў гучанні ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Дынаміка як мастацка-выразны сродак гучання і яе спецыфіка пры выканальніцтве на беларускіх народных духавых інструментах.

Паняцце аб рэльефе, фоне, аб'ёме і дынаміка-акустычным балансе ў гучанні ансамбля беларускіх народных духавых інструментаў.

Шляхі дасягнення аб'ёму прасторавага дынаміка-акустычнага гучання ансамбля беларускіх народных духавых інструментаў. Развіццё выканальніцкіх навыкаў для дасягнення збалансаванага гучання ў ансамблі беларускіх народных духавых інструментаў.

Асаблівасці суадносін кантрасту дынамікі гучання інструментальных груп у ансамблі беларускіх народных духавых інструментаў.

Узаемасувязь дынаміка-акустычнай асаблівасці гучання ансамбля беларускіх народных духавых інструментаў і музычнай фактуры твора ў выканальніцкім працэсе.

### *Тэма 10. Асаблівасці работы над метрарытмічнымі цяжкасцямі ў гучанні ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Паняцці «метр» і «рытм», іх сутнасць у музычным мастацтве. Метрарытм як адзін з галоўных элементаў і сродкаў выразнасці ў музычным мастацтве. Формаўтваральнае значэнне рытму ў выканальніцкай практыцы. Развіццё навыкаў выканання розных метрарытмічных камбінацый у гучанні ансамбля беларускіх народных духавых інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Работа над практыкаваннямі з мэтай дасягнення дакладнасці метрарытму ў гучанні ансамбля беларускіх народных духавых інструментаў.

### *Тэма 11. Развіццё навыкаў чытання нот з ліста ўдзельнікаў ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Сутнасць і значнасць працэсу засваення навыкаў чытання нот з ліста незнаёмых твораў.

Развіццё выканальніцкіх навыкаў чытання нот з ліста незнаёмых твораў, інтэнсіўнага засваення музычнага матэрыялу з мэтай пашырэння і засваення педагагічнага і канцэртнага рэпертуару. Спосабы развіцця навыкаў чытання нот з ліста. Актывізацыя і развіццё музыкальных здольнасцей у працэсе чытання нотнага тэксту ў складзе ансамбля народных духавых інструментаў.

### *Тэма 12. Этапы работы над музычнымі творамі для ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Змест этапу першапачатковага знаёмства з музычным творам для ансамбля беларускіх народных духавых інструментаў (партытура, аўдыя- і відэазапіс, кампакт-дыск, праслухоўванне сродкамі масавых камунікацый трансляцый музычных выступленняў мастацкіх калектываў). Дэталёвы музычна-выканальніцкі аналіз асаблівасцей вывучаемага твора і задача па мастацкім увасабленні адпаведных музычных вобразаў у працэсе ансамблевага выканальніцтва на народных духавых інструментах.

Работа над асноўнымі эпізодамі музычнага твора (развіццё навыкаў сумеснага выканальніцтва з улікам тэхнічных ансамблевых цяжкасцей: дынамічны баланс; штрыхі; фразіроўка; выкананне дробнай тэхнікі; інтанацыя і інш.). Шляхі вырашэння музычна-выканальніцкіх задач па стварэнні музычных вобразаў у працэсе канчатковага рэпетыцыйнага этапу ансамблевага выканальніцтва ў адпаведнасці з патрабаваннем музычных твораў (арыгінал, інструментоўка і г. д.).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 13. Расшыфроўка беларускай народнай музыкі*

Праслухоўванне запісаў лепшых узораў выканання народнай музыкі і працэс іх адбору з мэтай далейшай працы для выканання ансамблем народных духавых і ўдарных інструментаў.

Тэхналогія расшыфроўкі народнай музыкі і яе фіксацыя ў нотна-графічным выглядзе.

Дасягненне адпаведнай манеры гучання народнага выканальніцтва ўдзельнікамі ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у адпаведнасці з фіксаваным узорам народнай музыкі з дапамогай музычнага запісу, партытуры.

### *Тэма 14. Асаблівасці работы над народна-песеннымі і харавымі творамі для іх выканання ансамблем беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Мастацкая і сацыякультурная значнасць народна-песеннай і харавой спадчыны беларускага народа. Формы адаптацыі народна-песенных і харавых твораў і спецыфіка іх выканання ўдзельнікамі ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў (работа па вывучэнні рэпертуару; аранжыроўка і інтэрпрэтацыя традыцыйных народна-песенных і харавых твораў; асаблівасці сцэнічнага майстэрства і інш.).

Развіццё выканальніцкіх здольнасцей удзельнікаў ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў. Спалучэнне вакальна-інструментальнага выканальніцтва ў межах вывучаемага музычнага твора ўдзельнікамі ансамбля.

### *Тэма 15. Развіццё навыкаў выканання на слых удзельнікамі ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Пытанні засваення сутнасці і творча-тэхналагічных аспектаў працэсу ігры па слыху ў галіне музычна-інструментальнай творчасці і ў кантэксце нацыянальнай традыцыйнай выканальніцкай практыкі Беларусі.

Развіццё навыкаў ігры па слыху як форма, паказальнік музычнай памяці і здольнасць дакладнага аднаўлення праслуханай мелодыі. Асаблівасці працэсу навучання падбору па слыху традыцыйных народных мелодый у складзе ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў. Спецыфіка працэсу навучання асаблівасцям падбору гарманічнага супра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваджэння ўдзельнікамі калектыву ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў.

Развіццё імправізацыйна-варыяцыйных спосабаў выканання. Выкарыстанне спецыфічных прыёмаў і штрыхоў традыцыйнага народна-інструментальнага выканальніцтва.

### *Тэма 16. Увасабленне зместу музычных твораў, варыянтная шматлікасць іх трактовак*

Стварэнне мастацкага вобраза на аснове авалодання ўсімі існуючымі сродкамі музычнай выразнасці з улікам традыцыйнай выканальніцкай манеры народна-інструментальнай практыкі.

Інтэрпрэтацыя як тлумачэнне аўтарскіх тэкстаў, працэс выпрацоўкі пэўнай мастацкай канцэпцыі і пошуку выразных магчымасцей з мэтай дакладнага канцэртна-сцэнічнага ўвасаблення зместу і характару твора.

Суадносіны кампазітарскага і выканальніцкага ўвасаблення музычнага твора, параўнальны аналіз і патрабаванні да магчымых шматлікіх іх трактовак.

### *Тэма 17. Функцыянальныя мастацка-выразныя магчымасці ансамбляў беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Вывучэнне на практычных занятках спецыфікі функцыянальных мастацка-выразных магчымасцей ансамбляў беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў.

Спецыфіка і рэалізацыя функцыянальных мастацка-выразных магчымасцей ансамбляў беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у працэсе выканання вучэбнага і канцэртнага музычна-інструментальнага рэпертуару.

Спецыфіка і рэалізацыя функцыянальных мастацка-выразных магчымасцей ансамбляў беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў як акампаніруючага саставу для ўвасаблення вакальна-харавых твораў.

Спецыфіка і рэалізацыя функцыянальных мастацка-выразных магчымасцей ансамбляў беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у працэсе падрыхтоўкі і выканання канцэртнага нумара сумесна з харэаграфічным калектывам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 18. Жанрава-стылявыя асаблівасці выканання старадаўняй і сучаснай музыкі ансамблем беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Вывучэнне асноў жанрава-стылявых кірункаў існуючай выканальніцкай практыкі. Асаблівасці выканання і інтэрпрэтацыі старадаўняй музыкі ансамблем беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў. Расшыфроўка знакаў скарачэння нотнага запісу і мелізматыкі.

Асаблівасці выканання эстрадных і джазавых твораў з улікам спецыфічнай манеры і стылю выканання. Тэхнічныя сродкі ў працэсе вывучэння жанрава-стылявых асаблівасцей (выкарыстанне сінтэзатараў і камп'ютарная апрацоўка музычнага матэрыялу з мэтай стварэння фанаграм *«–1»*). Дасягненне мастацкіх эфектаў шляхам злучэння беларускіх народных духавых інструментаў і сучаснага музычнага інструментарыя: аркестравыя духавыя інструменты ў складзе ансамбля; эпізадычныя інструменты; электрафікаваныя сучасныя музычныя інструменты – разнастайнасць клавішных інструментаў, бас-гітара; ударная ўстаноўка і перкашын і інш.

### *Тэма 19. Арганізацыйна-практычныя пытанні канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ўдзельнікаў ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Сутнасць, арганізацыйна-творчыя асаблівасці і сацыякультурныя аспекты канцэртнай дзейнасці ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў. Роля канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ў фарміраванні мастацкага густу і эстэтычнага выхавання слухачоў. Развіццё выканальніцкіх навыкаў удзельнікамі ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў.

Шляхі ўдасканалення прафесійнага майстэрства кіраўнікоў ансамблевых калектываў па арганізацыі іх канцэртна-выканальніцкай дзейнасці. Асаблівасці падрыхтоўкі канцэртных нумароў для ўдзелу калектыву ансамбля народных духавых і ўдарных інструментаў у значных сацыякультурных мерапрыемствах. Арганізацыйныя пытанні падрыхтоўкі ўдзельнікаў ансамбля да канцэртнага выступлення, практыкаванні па эмацыянальна-псіхалагічнай падрыхтоўцы выканаўцаў і пытанні фарміравання адпаведнага рэпертуару.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 20. Асаблівасці мастацка-творчых пытанняў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ўдзельнікаў ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў*

Сутнасць жанрава-стылявых і сацыяльна-ўзроставых умоў арганізацыі канцэртнай дзейнасці ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў (дыферэнцыраваны падыход у складанні выконваемай канцэртнай праграмы, разлічанай на розны музычны густ той ці іншай сацыяльнай групы). Улік эстэтыка-сцэнічных умоў (антураж, сцэнічны выгляд і імідж у адпаведнасці са стылем і эпохай выконваемых твораў). Засваенне сутнасці і асаблівасці акустыкі і тэхнічна-інструментальнага забеспячэння выступленняў ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у канцэртнай зале або на пленэры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва тэм заняткаў | Агульная колькасць гадзін: лекцыі | семінар. | практ. | індывід. | КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Уводзіны | | | | | | |
| Тэма 1. Змест, асноўныя задачы дысцыпліны | | | 1 | | | тэст |
| Тэма 2. Арганізацыя заняткаў з ансамблем народных духавых і ўдарных інструментаў: функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыпавых саставаў | | | 5 | | 5 | франт. апытанне |
| Тэма 3. Засваенне сутнасці ансамблевага выканальніцтва і яго роля ў развіцці творчых здольнасцей выканаўцаў на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах | | | 14 | | 2 | франт. апытанне |
| Тэма 4. Псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя асаблівасці развіцця асабістых выканальніцкіх здольнасцей удзельнікаў ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 6 | | 5 | франт. апытанне |
| Тэма 5. Штрыхі, традыцыйныя і спецыфічныя прыёмы гукаўтварэння ўдзельнікамі ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 36 | | 18 | індыв. заданні |
| Тэма 6. Сістэмы настройкі беларускіх народных духавых інструментаў | | | 12 | | 6 | індыв. заданні |
| Тэма 7. Праблема інтанавання ў практыцы ансамблевага выканальніцтва на беларускіх народных духавых інструментах | | | 22 | | 2 | індыв. практыкаванні |
| Тэма 8. Асаблівасці работы над фразіроўкай пры выкананні твораў для ансамбляў беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 22 | | 14 | індыв. заданні |
| Тэма 9. Праблемы дынаміка-акустычнага балансу ў гучанні ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 18 | | 1 | індыв. практыкаванні |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Тэма 10**.** Асаблівасці работы над метра-рытмічнымі цяжкасцямі ў гучанні ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 22 | | 1 | індыв. заданні |
| Тэма 11. Развіццё навыкаў чытання нот з ліста ўдзельнікаў ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 22 | | 2 | індыв. практыка-ванні |
| Тэма 12. Этапы работы над музычнымі творамі для ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 10 | | 1 | індыв. заданні |
| Тэма 13. Расшыфроўка беларускай народнай музыкі | | | 14 | | 1 | індыв. практы-каванні |
| Тэма 14. Асаблівасці работы над народна-песеннымі і харавымі творамі для іх выканання ансамблем беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 20 | | 1 | індыв. практыка-ванні |
| Тэма 15. Развіццё навыкаў выканання на слых удзельнікамі ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 20 | | 2 | індыв. практыка-ванні |
| Тэма 16. Увасабленне зместу музычных твораў, варыянтная шматлікасць іх трактовак | | | 16 | | 1 | індыв. заданні |
| Тэма 17. Функцыянальныя мастацка-выразныя магчымасці ансамбляў беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 20 | | 1 | індыв. заданні |
| Тэма 18. Жанрава-стылявыя асаблівасці выканання старадаўняй і сучаснай музыкі ансамблем беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 18 | | 1 | індыв. заданні |
| Тэма 19. Арганізацыйна-практычныя пытанні канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ўдзельнікаў ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 4 | | 1 | індыв. практыка-ванні |
| Тэма 20. Асаблівасці мастацка-творчых пытанняў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ўдзельнікаў ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | | | 10 | | 1 | індыв. практыка-ванні |
| **Усяго…** | | | **312** | | **70** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Арыгінальныя творы, апрацоўкі, інструментоўкі, прапануемыя для выканання ў ансамблях на беларускіх народных духавых інструментах

### I. Аднайменныя саставы

#### *Ансамблі дуд*

*Беларускі народны танец.* Кругавая. Апр. У. Грома.

*Беларускі народны танец.* Шастак. Апр. У. Грома.

*Варыяцыі* на тэму беларускіх народных вясельных песень. Апр. У. Грома.

*Гром У.* Заездзіў коніка.

### II. Роднасныя саставы

#### *Ансамблі дудак*

*Агінскі М. К.* Паланэз соль-мажор. Інстр. А. Крамко.

*Беларуская песня.* У зялёным лузе каліна стаяла. Апр. А. Крамко.

*Беларуская народная песня.* А ў полі вярба. Інстр. У. Грома.

*Беларуская народная песня.* А дзе была, Купалачка? Апр. У. Грома.

*Беларускі народны танец.* Лявоніха. Апр. А. Крамко.

*Глебаў Я.* Танец з «Палескай сюіты». Інстр. А. Крамко.

*Гайдан І.* Менуэт ракако. Апр. У. Грома.

*Глінка М.* Арагонская хота (фрагмент). Апр. У. Грома.

*Дывертысмент № 150* (Ягелонскі рукапіс, ці так званы «Полацкі сшытак»). Апр. У. Грома.

*Казлоўскі В.* Кантраданс. Інстр. У. Грома.

*Крамко А.* У дубраўцы.

*Радзівіл М.* Паланэз соль-мажор. Паланэз до-мажор.

*Сірата М.* Варыяцыі на дзве беларускія тэмы.

*Чуркін М.* Полька «Добры вечар». Інстр. А. Крамко.

*Шырокаў А.* Дударыкі.

#### *Ансамблі акарын*

*Беларуская народная песня.* А ў полі жыта не ярыцца. Апр. У. Грома.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Беларуская народная песня.* Рэчанька. Апр. А. Крамко.
*Беларускі народны танец.* Гнеўка. Апр. А. Крамко.
*Крамко А.* Гліняная цацка.
*Музыка народная.* Вальс «Спатканне». Апр. У. Грома.
*Мангушаў І.* Ранішні харал з сюіты «Галасы мінуўшчыны».

### *Ансамблі жалеек*

*Беларуская народная песня.* Як на Івана дужа рана. Апр. У. Грома.
*Вахуцінскі М.* Полька-жарт.
*Крамко А.* Менуэт.
*Крамко А.* Веснавая забаўка.
*Крамко А.* Жартоўная ўверцюра.
*Музыка народная.* Мазурка. Апр. У. Грома.
*Мангушаў І.* Каліна – маліна.
*Мангушаў І.* Ідзе каляда.
*Ціханаў С.* Танец у старадаўнім стылі. Інстр. У. Грома.
*Шырокаў А.* Іграюць пастушкі.

### *Ансамблі драўляных труб*

*Мангушаў І.* Весялуха.
*Мангушаў І.* Купальскае шэсце.
*Мангушаў І.* Рана сонейка ўзышло.
*Мангушаў І.* Старажытная фанфара.

## III. Змешаныя саставы

*Беларуская народная песня.* Смутны вечар. Апр. У. Грома.
*Гальярда № 132* (Ягелонскі рукапіс, ці так званы «Полацкі сшытак»). Апр. У. Грома.
*Клеванец А.* Беларускі краявід.
*Мангушаў І.* Галасы мінуўшчыны: сюіта. У 7 ч.:
1. Баль у маёнтку Агінты.
2. Водгукі стагоддзяў.
3. Гавот – пастараль.
4. На Грунвальд.
5. Ранішні харал.
6. Святочны паланэз.
7. Скакуха.
*Мангушаў І.* Казка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мангушаў І.* Пяты вугал.

*«Фаталія блажэнная» № 96* (Ягелонскі рукапіс, ці так званы «Полацкі сшытак»). Апр. У. Грома.

*Шадурскі Ю.* Танец багоў з аперэты «Тарас на Парнасе». Інстр. А. Крамко.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Прапануемыя рэпертуарныя зборнікі і метадычныя выданні, якія неабходна выкарыстоўваць у рабоце з ансамблямі

*1.* Беларуская каталіцкая музыка: Касцёльныя песні: для змеш. хору / Беларус. каталіц. грамада. Муз. згуртаванне беларус. каталікоў ; уклад. У. Неўдах. – Мінск, 1992. – 90 с.

*2.* Беларуская музыка XVI–XVII стагоддзяў : вучэб.-метад. рэкамендацыі для ігры ў ансамблях / Рэсп. метад. кабінет па навуч. установах мастацтваў і культуры ; уклад. Л. П. Касцюкавец. – Мінск, 1990. –139 с.

*3. Буданков, О. А.* Практический курс игры на русских народных духовых и ударных инструментах / О. А. Буданков, М. Б. Вахутинский, В. К. Петров. – М. : Музыка, 1991. – 191 с. : ноты.

*4. Гром, У. М.* Дударэньку-гаспадэньку : рэпертуар. зб. для аматараў ігры на дудзе / У. М. Гром. – Мінск : БелІПК, 1999. – 54 с.

*5. Гром, У. М.* Сядзіць галубок над крыніцаю : зб. беларус. нар. песень / У. М. Гром ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1999. – 68 с.

*6. Гром, У.* Галасы мінуўшчыны : зб. інструм. ансамбляў для беларус. нар. духавых інструментаў / У. Гром, А. Крамко, І. Мангушаў ; Беларус. ін-т культуры. – Мінск, 2003. –130 с.

*7.* Европейская танцевальная музыка 17–18 веков: Из арх. собр. Рос. нац. б-ки: для аккордеона / исполнит. ред. для аккордеона Г. Писняк. – Могилев : Пересвет, 1995. – 40 с.

*8.* Інструментальная музыка Беларусі XVIII стагоддзя / Рэсп. метад. кабінет па навуч. установах мастацтваў і культуры ; склад. В. У. Дадзіёмава. – Мінск, 1991. – 111 с.

*9.* Новая радасць стала : хрэстаматыя па духоўнай харавой музыцы / Беларус. ін-т праблем культуры ; уклад.: А. В. Пякуцька, З. Л. Леановіч, В. П. Маеўская ; муз. рэд. Я. М. Рэутовіч. – Мінск, 1995. – 60 с.

*10.* Помнікі музычнай культуры Беларусі: Інструментальная музыка XIX стагоддзя / Беларус. ін-т праблем культуры ; уклад. А. І. Ахвердава. – Мінск, 1993. – 90 с.

*11.* Рэлігійная музыка Беларусі XVII–XVIII стагоддзяў : хрэстаматыя / уклад. Т. У. Ліхач ; Беларус. дзярж. акад. музыкі. – Мінск, 2000. – 58 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА


*Асноўная*

*1.* Аналіз і транскрыпцыя народнай інструментальнай музыкі : прагр. курса па спецыяльнасці «народная творчасць» (спецыялізацыя «інструментальная творчасць» – народныя інструменты) / Беларус. ун-т культуры ; склад. А. В. Скорабагатчанка. – Мінск, 1996. – 12 с.

*2. Антоневич, В. А.* Народное исполнительское искусство как один из источников обогащения профессионального творчества на современном этапе / В. А. Антоневич // Вопросы культуры и искусства Белоруссии : Респ. межвед. сб. – Минск : Выш. шк., 1982. – Вып. 1. – С. 68–71.

*3.* Беларуская народная інструментальная музыка : Фоназапісы, натацыя / рэд. і сістэматызацыя найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І. Д. Назінай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 655 с. – (Беларус. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).

*4.* Белорусские народные наигрыши / сост. и авт. вступ. ст. И. Д. Назина ; под общ. ред. В. Петрова. – М. : Музыка, 1986. – 12 с.

*5. Благовещенский, И. П.* К истории белорусской народной инструментальной музыки / И. П. Благовещенский // Некоторые вопросы музыкального искусства (педагогика, эстетика, фольклор). – Минск, 1965. – С. 103–143.

*Дадатковая*

*1. Дадзёмава, В. У.* Гісторыя музычнай культуры Беларусі ад старажытнасці да XVIII ст. : дапам. для сярэд. навуч. устаноў гуманіт. профілю / В. У. Дадзёмава. – Мінск : БГАКЦ, 1994. – 96 с.

*2. Карацееў, А. Л.* Ансамблі духавых інструментаў у гісторыі музычнай культуры Беларусі / А. Л. Карацееў // Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва : тэз. дакл. на навук.-творч. канф. (19–20 крас. 1994 г.) / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1994. – С. 45–46.

*3. Коротеев, А. Л.* Духовое искусство Беларуси : жанрово-стилистические поиски и перспективы развития / А. Л. Коротеев // Музыкальное искусство на рубеже столетий : материалы Междунар. науч. конф. «Музыкальное творчество и


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XXI век : традиции, новации и перспективы», г. Минск, 21 апр. 2000 г. – Минск, 2000. – С. 41–45.

4. *Мишуров, Г. С.* Белорусское народно-инструментальное искусство : традиции и современность / Г. С. Мишуров. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры, 2002. – 300 с.

5. *Скорабагатчанка, А. В.* Беларускі музычны фальклор. Інструментальная традыцыя / А. В. Скорабагатчанка / Рэсп. навук.-метад. цэнтр культуры ; Мін. ін-т культуры. – Мінск, 1990. – 161 с.

6. *Яконюк, Н. П.* Народно-оркестровая культура Белоруссии : традиции и новаторство / Н. П. Яконюк // Роль оркестров народных инструментов в межэтническом общении : сб. / Рос. акад. музыки им. Гнесиных. – М., 1999. – Вып. 153. – С. 49–75.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка творча-выканальніцкіх кантрольных работ (асабістых заданняў па выкананні ансамблевых партый);

– напісанне варыянтаў адаптацыі асабістай ансамблевай партыі вывучаемага музычнага твора па вучэбным плане дысцыпліны;

– састаўленне варыянтаў індывідуальнага плана работы студэнта па падрыхтоўцы асабістых ансамблевых партый;

– франтальнае апытанне студэнтаў з мэтай выканання асабістай ансамблевай партыі на практычных занятках па пераліку вывучаемых твораў;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па актуальных праблемах вывучаемай вучэбнай дысцыпліны.

## Патрабаванні да арганізацыі кіруемай самастойнай работы студэнтаў

Падрыхтоўка студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Народнаансамблевае выканальніцтва» прадугледжвае арганізацыю асабістай пазааўдыторнай самастойнай работы студэнтаў з мэтай падрыхтоўкі да бягучых форм кантролю і выніковых іспытаў іх асабістых ведаў, навыкаў і ўменняў. Акрамя гэтага, студэнты таксама маюць магчымасць выканання асабістых практыкаванняў і творчых заданняў па сумесным выкананні народнай музыкі ў розных народна-інструментальных ансамблях падчас вытворчай практыкі, у межах падрыхтоўкі матэрыялаў з выкарыстаннем элементаў навукова-даследчай дзейнасці (рэферат ці выступленне на семінары, паведамленне ці даклад на канферэнцыі па выніках НДДС, удзел у конкурсе студэнцкіх навуковых работ і г. д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя ўказанні па выкананні самастойнай работы студэнтаў

Падчас падрыхтоўкі матэрыялаў па вывучэнні матэрыялаў вучэбнай дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканальніцтва» студэнт павінен улічваць наступныя патрабаванні:

I. Згодна з вучэбным планам практычныя заняткі па вучэбнай дысцыпліне «Народна-ансамблевае выканальніцтва» ажыццяўляюцца ў форме агульнагрупавых рэпетыцый на практычных занятках. На працягу кожнага семестра студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыка павінны падрыхтаваць не толькі 3–4 ансамблевых твора да акадэмічнага выступлення і адпаведнага іспыту, але і выканаць на асабістым інструменце не менш трох партый незнаёмых аркестравых твораў, якія неабходна падрыхтаваць падчас арганізацыі асабістай самастойнай работы ў складзе студэнцкага калектыву – ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных музычных інструментаў. Студэнт павінен памятаць, што галоўнымі аб’ектамі на занятках дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканальніцтва» з’яўляюцца: інтанацыйная чысціня, сінхроннасць і збалансаванасць гучання па вертыкалі і гарызанталі, дакладнасць метрарытму, а таксама ўраўнаважанасць дынамікі, выразнасць фразіроўкі, артыкуляцыі і штрыхоў, агульнасць выканальніцкага дыхання, выяўленне рэльефнай меладычнай лініі і фону. І гэтыя пытанні неабходна вырашыць у сумеснай практычнай самастойнай рабоце з удзельнікамі адпаведнага складу ансамбля.

Падчас гэтай працы студэнт павінен не толькі набыць практыку засваення ансамблевых партый для народна-ансамблевага музіцыравання, але і рэалізаваць асабістыя мастацкія навыкі ў якасці ўдзельніка калектыву з магчымымі элементамі імправізацыйнага выканання ў традыцыйнай народна-выканальніцкай манеры. Акрамя гэтага, студэнт таксама павінен засвоіць навыкі выкарыстання сучасных прыёмаў і штрыхоў, якія характэрныя для эстраднай і джазавай музыкі.

II. З мэтай атрымання неабходных ведаў па вучэбнай дысцыпліне звяртацца да вывучэння адпаведных матэрыялаў, якія адлюстраваны ў спецыяльных выданнях (*манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, метадычныя рэкамендацыі, матэрыялы навуковых ці навукова-практычных канферэнцый* і г. д.), экспазіцыі выстаў, музеяў, якія дэманструюцца ці знаходзяцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў асноўных фондах (неабходнай умовай з'яўляецца таксама і вывучэнне экспанатаў запаснікаў).

III. Пазнаёміцца з нотным матэрыялам твораў, якія прызначаны (ці прадугледжваюць адаптацыю) дзеля выканальніцтва складам ансамбля беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў.

IV. Праслухаць фанаграмы з мэтай вывучэння мастацка-выразных асаблівасцей узораў выступленняў лепшых айчынных ансамбляў з удзелам выканаўцаў на народных духавых і ўдарных музычных інструментах.

V. Прапанаваны рэпертуар і спецыяльная літаратура вучэбнай дысцыпліны «Народна-аркестравае выканальніцтва» падчас арганізацыі самастойнай работы дазволяць студэнтам у дастатковай ступені развіваць навыкі сумеснага ансамблевага выканання, а таксама будуць спрыяць пашырэнню іх кругагляду па пытаннях і сацыякультурнай значнасці папулярызацыі музычнага мастацтва сродкамі калектыўнай формы музіцыравання ў складзе ансамбля народных духавых музычных інструментаў.

## Практычныя заданні
## па выкананні самастойнай работы студэнтаў

Дзеля ажыццяўлення самастойнай падрыхтоўкі студэнтам, з мэтай засваення неабходных матэрыялаў вучэбнай дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканальніцтва», прапануюцца наступныя пытанні:

1) у працэсе вывучэння матэрыялаў дысцыпліны <u>напісаць</u> асабістыя ансамблевыя партыі з варыянтамі магчымай змены лабіяльных ці флейтавых, лінгвальных ці язычковых, амбушурных ці мундштучных беларускіх народных духавых музычных інструментаў (напрыклад, змена партыі дудкі на партыю жалейкі, ці змена партыі жалейкі на партыю дуды і г. д.);

2) <u>адзначыць</u> асаблівасці арганізацыі заняткаў з ансамблем беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў;

3) <u>напісаць</u> характарыстыкі, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыпавых ансамблевых саставаў з удзелам выканаўцаў на беларускіх народных духавых музычных інструментах з улікам іх функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) напісаць характарыстыкі народных ударных інструментаў з улікам іх функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей;

5) напісаць прыклады выкарыстання капэл беларускіх народных духавых музычных інструментаў у сучаснай айчыннай выканальніцкай ансамблевай практыцы;

6) напісаць прыклады размеркавання галасоў у партытурах для ансамбляў духавых і ўдарных інструментаў у адпаведнасці з іх нотна-графічным афармленнем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**НАРОДНА-АНСАМБЛЕВАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 11 Духавыя інструменты (народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,03. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.